


## § 1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету, прадмет і задачы ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця

***Успомніце.*** Хто з вучоных першым ужыў тэрмін «геаграфія»? Чаму карту называюць альфай і амегай геаграфіі? Чаму геаграфія мае права называцца самастойнай навукай?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму сучаснаму чалавеку настолькі неабходныя веды ў галіне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі? Выкажыце здагадку, як эканамічная геаграфія можа дапамагчы ў развіцці дзяржавы. Ці ўзрастае роля геаграфіі як навукі ва ўмовах глабалізацыі?

**Прадмет і задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.** Кожная навуковая дысцыпліна ўносіць свой уклад у фарміраванне нашых уяўленняў пра свет. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету (СЭГ свету) з'яўляецца адной з найцікавейшых геаграфічных дысцыплін, таму што толькі яна дазваляе адначасова адказаць на тры пытанні пра любую тэрыторыю або краіну: якія тут размешчаны рэсурсы, чым характарызуецца насельніцтва і як развіваецца гаспадарка. А калі да атрыманага адказу далучыць гістарычныя веды і геаграфічнае мысленне, можна зрабіць прагноз дэмаграфічнай і сацыяльна-эканамічнай будучыні краіны.

Сацыяльна-эканамічная геаграфія — гэта галіна навукі, якая вывучае геаграфічныя заканамернасці развіцця насельніцтва, сусветнай гаспадаркі і яе сувязей, працэсаў на палітычнай карце свету або ў цэлым тэрытарыяльную арганізацыю грамадства ў свеце і асобных краінах.

Таму *прадметам вывучэння* сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляюцца дынаміка палітычнай карты свету; працэсы, звязаныя з вывучэннем геаграфіі насельніцтва; узаемаабумоўленасць прыродных рэсурсаў, гаспадаркі і грамадства; прастора-часавыя заканамернасці дынамікі сектараў сусветнай гаспадаркі.

Спецыфічнай асаблівасцю сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляецца тое, што яна вывучае аб'екты з пункту гледжання іх тэрытарыяльнай арганізацыі, г. зн. узаемаразмяшчэння, узаемадзеяння і ўзаемадапаўнення. У гэтым заключаецца практычная значнасць сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

Ва ўмовах глабалізацыі і пераходу да постындустрыяльнай стадыі перад сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй стаіць шырокі пералік задач (мал. 1).

1. Вывучэнне фактараў змен на палітычнай карце свету

2. Тлумачэнне геаграфіі палітычных канфліктаў, асаблівасцей геапалітычных працэсаў

3. Комплекснае вывучэнне дэмаграфічных працэсаў і працэсаў рассялення людзей

4. Вывучэнне фактараў і дынамікі развіцця сусветнай гаспадаркі

5. Комплекснае вывучэнне мінеральна-сыравінных рэсурсаў, фактараў размяшчэння і геаграфіі сектараў сусветнай гаспадаркі

6. Тлумачэнне эколага-арыентаваных змен у структуры сусветнай гаспадаркі ва ўмовах постындустрыялізацыі

Мал. 1. Асноўныя задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету

Эканоміка-геаграфічнае вывучэнне краін, або краіназнаўства, у цяперашні час становіцца ўсё больш гарманічнай часткай трох асноўных аб'ектаў СЭГ свету — палітычнай карты свету, насельніцтва і сусветнай гаспадаркі.

**Уклад выбітных вучоных у развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.** Кожная навука ганарыцца імёнамі вучоных, даследчыкаў, якія сваімі намаганнямі зрабілі значны ўклад у яе развіццё. На працягу многіх стагоддзяў фарміраваліся навуковыя школы эканамічнай геаграфіі: нямецкая, французская, брытанская, расійская, амерыканская, беларуская і інш. Мы спынімся на вучоных, якія зрабілі найбольш значны ўклад у разуменне тых пытанняў, якія вам давядзецца вывучыць у гэтым навучальным годзе.



Мал. 2. В. М. Тацішчаў (1686–1750)

Упершыню комплексны погляд на сацыяльна-эканамічную геаграфію як навуковы напрамак, які вывучае прыроду, насельніцтва і гаспадарку ва ўзаемнай абумоўленасці і залежнасці, у сваіх работах выклаў расійскі вучоны В. М. Тацішчаў (мал. 2). Надзвычай важным было абгрунтаванне вучонымі значнасці геаграфіі для «ваеннага і земскага кіравання». Гэтая думка пацвярджаецца сучаснай



Мал. 3. М. В. Ламаносаў (1711–1765)



Мал. 4. М. М. Баранскі (1881–1963)



Мал. 5. Ю. Г. Савушкін (1911–1982)

запатрабаванасцю сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў практыцы рэгіянальнага кіравання.

Пра ўзаемасувязь прыродных і эканамічных з'яў, насельніцтва, гаспадаркі краін і фактараў размяшчэння вытворчых сіл пісаў выбітны рускі вучоны М. В. Ламаносаў (мал. 3). Ён таксама растлумачыў неабходнасць вывучэння насельніцтва як крыніцы «магутнасці дзяржавы», прычын скарачэння колькасці насельніцтва і прыняцця мер, якія б спрыялі яго росту.

Пра неабходнасць вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі на розных тэрытарыяльных узроўнях (свет, рэгіён, краіна) упершыню было адзначана ў работах выбітнага савецкага эканомікагеографа М. М. Баранскага (мал. 4). Таксама гэты вучоны сфармуляваў азначэнне паняцця «геаграфічны падзел працы» і асновы краіназнаўства.

Прынцыпы раяніравання і геаграфічнага прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны былі распрацаваныя знакамітым савецкім эканомікагеографам Ю. Г. Савушкіным (мал. 5).

**Свет і Беларусь.** Геаграфічная навука ў Беларусі адыгрывае важную ролю ў планаванні эканомікі, сацыяльным развіцці, фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці і забяспечвае навуковую базу для кіравання тэрыторыямі і рэсурсамі. Успомніце з «Геаграфіі Беларусі», якую вы вывучалі ў 9 класе, імя выбітнага беларускага вучонага-эканомікагеографа і яго ўклад у развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

**Месца сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў сістэме навук.** Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету пашырае і паглыбляе веды пра свет як складаную сацыяльную, эканамічную, палітычную, культурную і экалагічную сістэму пры цесным узаемадзеянні са многімі навукамі.

***У свеце ўсё ўзаемазвязанае.*** У эпоху глабалізацыі і імклівых тэхналагічных змен роля сацыяльна-эканамічнай геаграфіі набывае асаблівае значэнне. Яна выступае своеасаблівым компасам, які дазваляе арыентавацца ў складанай сацыяльна-эканамічнай прасторы. З якімі навукамі сацыяльна-эканамічная геаграфія мае найбольш цесныя сувязі? Якім чынам звязаныя паміж сабой GPS-навігатар і геаграфія?

Сацыяльна-эканамічная геаграфія звязаная са шматлікімі напрамкамі *фізічнай геаграфіі*: кліматалогіяй, гідралогіяй, метэаралогіяй, глебазнаўствам, біягеаграфіяй і інш. Напрыклад, без ведаў пра тэктанічную будову, прыродныя ўмовы, кліматычныя і глебавыя асаблівасці тэрыторыі або краіны немагчыма патлумачыць заканамернасці размяшчэння карысных выкапняў, спецыялізацыю і геаграфію сельскай гаспадаркі, галіновую структуру і геаграфію прамысловасці і інш.

Выкарыстоўваючы *картаграфічныя спосабы* і *тэхналогіі геаінфармацыйных сістэм (ГІС)* для стварэння выяў розных аб'ектаў, сацыяльна-эканамічная геаграфія распрацоўвае мадэлі развіцця галін гаспадаркі.

Гістарычны падыход пры вывучэнні палітычнай геаграфіі, насельніцтва, галін сусветнай гаспадаркі выступае адным з асноўных пры тлумачэнні працэсаў, якія адбываюцца. Таму сацыяльна-эканамічная геаграфія свету цесна звязаная з *гісторыяй*.

Вывучэнне насельніцтва абапіраецца на разнастайныя дэмаграфічныя паказальнікі. Для гэтага сацыяльна-эканамічная геаграфія свету звяртаецца да *дэмаграфіі*.

Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету цесна звязаная з *эканомікай*. Напрыклад, без ведання паказальнікаў эканомікі, знешняга гандлю, аб'ёмаў вытворчасці і інш. нельга правесці аналіз узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, выявіць яе гаспадарчую спецыялізацыю, структуру гандлю. У даследаваннях асобных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак краіны (вобласць, штат, зямля і інш.) сацыяльна-эканамічная геаграфія ўзаемадзейнічае з *рэгіянальнай эканомікай*.

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. умацавалася ўзаемасувязь сацыяльна-эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі з *экалогіяй*. Гэта дазваляе па-новаму падысці да вырашэння праблем рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя рэгіёнаў і краін.

**Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.** Традыцыйнымі напрамкамі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляюцца палітычная геаграфія, геаграфія насельніцтва і геаграфія сусветнай гаспадаркі, якая, у сваю чаргу, падзяляецца на геаграфію сельскай гаспадаркі, геаграфію прамысловасці і геаграфію сферы паслуг.

Аднак гэтыя тры асноўныя напрамкі развіваюцца ў цяперашні час у новых умовах. Звыклую структуру СЭГ свету змяняюць працэсы, якія адбываюцца надзвычай маштабна ў XX ст.: рэгіянальныя канфлікты, хуткае развіццё навукі і тэхналогій, дэмаграфічны




Мал. 6. Новыя напрамкі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету

пераход і постындустрыяльныя тэндэнцыі, транснацыяналізацыя і глабалізацыя. Яны прыводзяць да з'яўлення новых напрамкаў у яе структуры (мал. 6).

**Роля СЭГ ва ўмовах глабалізацыі ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця.** На пачатку XXI ст. сацыяльна-эканамічная геаграфія стала найбольш важнай і дынамічнай з геаграфічных навук, таму што мае вялікае практычнае значэнне для аптымізацыі размяшчэння і ўдасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі і інш.

Ва ўмовах глабалізацыі і значных змен у геаграфіі насельніцтва і сусветнай гаспадаркі значна ўзрасла роля сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Практычная значнасць сацыяльна-эканамічнай геаграфіі выходзіць на першы план. У цяперашні час эканомікагеографы ўдзельнічаюць у вырашэнні найбольш важных пытанняў кіравання тэрытарыяльным развіццём (мал. 7).

Эканомікагеографы ажыццяўляюць сацыяльна-эканамічнае раяніраванне краіны, вылучаюць рэгіёны, іх межы, аналізуюць структуру і функцыі гаспадаркі. Яны прымаюць актыўны ўдзел у распрацоўцы прагнозаў і праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый, а таксама нацыянальных стратэгій устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця.



**Свет і Беларусь.** Рэспубліка Беларусь у 1997 г. адна з першых на постсавецкай прасторы распрацавала Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця (НСУР) на перыяд да 2010 г. Пасля яе рэалізацыі былі распрацаваныя НСУР на перыяд да 2020, 2030 і 2035 гг. У распрацоўцы ўсіх стратэгій удзельнічалі вядучыя вучоныя-эканомікагеографы Беларусі, у тым ліку з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Такім чынам, удзел у планаванні становіцца адметнай рысай дзейнасці сучасных эканомікагеографаў.

- Удасканаленне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу краіны
- Эканамічная ацэнка прыродных рэсурсаў
- Фарміраванне тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў і эканамічных кластараў
- Праектаванне гарадоў, транспартных камунікацый, размяшчэння прадпрыемстваў
- Распрацоўка рэгіянальных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця
- Распрацоўка сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай палітыкі
- Распрацоўка рэгіянальных прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця
- Распрацоўка брэнда тэрыторыі і інш.

Мал. 7. Практычная значнасць сацыяльна-эканамічнай геаграфіі

***Паразважаем.*** ГІС усё шырэй выкарыстоўваюцца ў бізнесе. Напрыклад, уладальнік сеткі магазінаў можа змясціць патэнцыяльных пакупнікоў на карце сваёй прадукцыі і такім чынам даведацца, у якіх раёнах горада яны пражываюць. Перавозчыкі грузаў павышаюць надзейнасць дастаўкі, эканомяць паліва і час за кошт аптымізацыі маршруту. Прадаўцы і пакупнікі нерухомай маёмасці выкарыстоўваюць ГІС-тэхналогіі, калі прымаюць рашэнні. Калі ўважліва паглядзець на карту, то можна знайсці рэзервы ў абслугоўванні, якія не заўважылі канкурэнты, запланаваць новыя гандлёвыя кропкі, адзначыць аптымальныя месцы для размяшчэння рэкламных шчытоў і многае іншае. А як яшчэ можна выкарыстоўваць ГІС-тэхналогіі ў сферы бізнесу? $П_1$

**Падвядзём вынікі.** Сацыяльна-эканамічная геаграфія вывучае … . Асноўнымі напрамкамі развіцця сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з'яўляюцца … . Ва ўмовах глабалізацыі роля геаграфічнай навукі пастаянна ўзрастае, паколькі … . Сацыяльна-эканамічная геаграфія мае вялікае … значэнне для аптымізацыі размяшчэння гаспадаркі і ўдасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі.

***Праверым свае веды.*** 1. Што з'яўляецца прадметам сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету? 2. Якія новыя навуковыя напрамкі ў ёй вылучаюцца і з чым гэта звязана? 3. У чым заключаецца практычнае значэнне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў сучасным свеце?

***Праверым свае веды.*** 1. Якія метады геаграфічных даследаванняў вы ведаеце? 2. Як выкарыстоўваюцца найноўшыя метады геаграфічных даследаванняў у сучасным грамадстве? $П_2$

***Ад простага да складанага.*** 1. Чаму СЭГ называюць «мабільнай» навукай? 2. Чаму сацыяльна-эканамічная геаграфія знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з іншымі навукамі?

3. Якія новыя напрамкі ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі могуць з'явіцца ў бліжэйшыя пяць гадоў?

П3

***Ад простага да складанага.*** 1. Падрыхтуйце паведамленне пра ГІС-тэхналогіі. 2. Падрыхтуйце міні-праект «Сацыяльна-эканамічная геаграфія ў маёй сям'і».

***Ад тэорыі да практыкі.*** Складзіце схему «Сувязь сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з іншымі навукамі».